*УДК 329.1/.6:32*

# ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ У САВЕЦКІ ПЕРЫЯД

**М. С. Мамекін**

*аспірант кафедры паліталогіі,*
*старшы выкладчык кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ,*
*Мінск, Беларусь*
*MamekinMS@bsu.by*

Публікацыя прысвечана аналізу асноўных этапаў савецкага перыяду ў гістарыяграфіі палітычных партый, а таксама даследаванню тэарэтычных і метадалагічных асаблівасцей галоўных работ аб палітычных партыяз, створаных у гэты перыяд.

***Ключавыя словы:*** палітычная партыя;гістарыяграфія;функцыі палітычных партый; класіфікацыя палітычных партый; непралетарскія партыі.

# THEORETICAL STUDIES OF POLITICAL PARTIES IN THE SOVIET PERIOD

**M. S. Mamekin**

*graduate student of Department of Political Science,*
*Senior Lecturer, Department of Political Science, Faculty of Law, BSU,*
*Minsk, Belarus*
*MamekinMS@bsu.by*

The publication is devoted to the analysis of the basic stages of the Soviet period in the historiography of political parties, as well as to the study of the theoretical and methodological features of the main works created during this period.

***Keywords:*** political party;historiography; functions of political parties; classification of political parties; non-proletarian parties.

У гістарыяграфіі[1] палітычных партый і рухаў постсавецкіх краін традыцыйна вылучаюцца тры асноўныя перыяды: дарэвалюцыйны, савецкі і сучасны [1, с. 5]. Савецкі перыяд варта падзяліць на некалькі эта-

[1] Пад *гістарыяграфіяй* разумеецца навуковая дысцыпліна і метад даследвання, што выкарыстоўваецца для выяўлення і пацверджання вернасці інфармацыі аб гістарычных фактах і які акцэнтуе ўвагу на аўтарах тэорый, крыніцах іх даследаванняў, аддзяленні фактаў ад інтэрпрэтацый.

паў са сваімі характарыстыкамі і змястоўным напаўненнем, пэўнымі публікацыямі і асаблівасцямі разгляду палітычных партый і рухаў. У якасці першага этапу варта вылучыць прамежак часу з 1917 па 1920-я гг.; храналагічныя рамкі другога этапу можна акрэсліць з 1930-х па канец1950-х гг.; трэці этап працягваўся прыкладна з 1960-х па сярэдзіну 1980-х гг. Сучасны перыяд складаецца з двух этапаў: пераходнага (канец 1980-х – пачатак 1990-х гг.), і найноўшага або постсавецкага (з сярэдзіны 1990–х гг. – па цяперашні час).

Можна вылучыць наступныя прычыны з’яўлення першых савецкіх даследаванняў палітычных партый і рухаў: абумоўленасць палітычнымі і ідэалагічнымі патрэбамі бальшавікоў, якія прыйшлі да ўлады; надзвычай важная роля партый у грамадска-палітычным жыцці як дарэвалюцыйнай Расіі, так і падчас палітыка-ідэалагічнага змагання з 1905 па 1917 гг. Нават усталяванне ў СССР аднапартыйнай сістэмы толькі падкрэслівае ўзрастанне значнасці партыйных формаў арганізацыі, бо ядро новай уладнай канструкцыі склалі менавіта структуры РКП(б). Вышэйзгаданыя фактары вызначылі цікавасць савецкіх навукоўцаў, у першую чаргу гісторыкаў, да праблематыкі палітычных партый, што атрымалі прызнанне ў якасці спецыяльнага прадмета вывучэння, без даследавання якога нельга было зразумець ход і тэндэнцыі гістарычнага развіцця, а таксама асаблівасці палітычнага працэсу першых двух дзесяцігоддзяў XX ст.

Для савецкай гістарыяграфіі першага этапу характэрныя работы гісторыка-публіцыстычнага і мемуарна-даследчага характару. Па меркаванні аўтараў працы “Гістарычная навука ў Маскоўскім універсітэце. 1755-2004”, манаграфіі і артыкулы ўніверсітэцкіх даследчыкаў 1920-х пачатку 1930-х гг., якія вывучалі гісторыка-партыйную праблематыку, напісаныя пераважна ў папулярнай форме, бо яны былі арыентаваны на “масавага чытача”: працоўнага, развітога селяніна, рабфакаўца, сярэдняга партыйца [2, с.144]. Такі падыход палягчаў успрыманне матэрыялу, прыводзячы да прамалінейнасці трактовак гістарычных і палітычных праблем, што стала адметнай рысай публікацый гэтага этапу.

Варта адзначыць, што на этапе з 1917 па 1920-ыя гг. паўнавартасныя навуковыя даследаванні не маглі з’явіцца па шэрагу прычын: недастатковая распрацоўка базы крыніц для даследаванняў, а таксама недахоп кваліфікаваных кадраў. Першыя савецкія публікацыі, якія тычацца палітычных партый і рухаў, насілі, галоўным чынам, агітацыйна-прапагандысцкі характар, бо пагроза ўладзе бальшавікоў працягвала існаваць. Заўважым, што на гэтым этапе роля асобных “дробнабуржуазных” і іншых “контррэвалюцыйных партый” ацэньвалася

не заўсёды выключна негатыўна. Напрыклад, У. І. Неўскі ў сваіх працах нават адзначаў некаторыя дасягненні меншавікоў у параўнанні з бальшавікамі ў іх палітычнай дзейнасці [1, с. 151].

Акрамя работ, прысвечаных асобным партыям і групам партый, у другой палове 1920-х гг. пачалі з'яўляцца даследаванні, якія змяшчаюць параўнальны аналіз праграм і дзейнасці ўсіх асноўных палітычных арганізацый у Расійскай імперыі. Найбольшая ўвага навукоўцаў у гэты час была накіравана на вывучэнне 1917 г. як часу максімальнай праявы шматпартыйнасці ў палітычным жыцці, пры гэтым асноўным прадметам даследаванняў сталі розныя канцэпцыі вырашэння аграрнага пытання [1, с.156].

Калі ў 1920-я гг. яшчэ назіраўся пэўны плюралізм меркаванняў, то ў канцы 1930-х гг. выданне "Гісторыі грамадзянскай вайны ў СССР" і "Кароткага курса гісторыі УКП(б)" зрабілі сталінскую інтэрпрэтацыю гісторыі партый і рухаў адзінай і бясспрэчнай. Другі этап савецкага перыяду гістарыяграфіі палітычных партый і рухаў звязаны з зацверджаннем і функцыянаваннем аднапартыйнай палітычнай сістэмы, што пакінула свой адбітак у навуковых даследаваннях гэтага этапу. У другой палове 1930-х– першай палове 1950-х гг. савецкімі навукоўцамі былі апублікаваныя манаграфіі, прысвечаныя ранім перыядам дзейнасці У. І. Леніна, выпрацоўцы праграмы РСДРП і інш. [2, с. 160]. Таксама, як адзначае С. У. Халяеў, у 1930-х гг., з набліжэннем Другой сусветнай вайны, значная ўвага савецкай гістарыяграфіі пераключылася на асвятленне ўзаемаадносін унутры самой бальшавіцкай партыі. Галоўным аб'ектам крытыкі савецкіх даследчыкаў становіцца Л. Д. Троцкі [3, с.26]. Менавіта на другім этапе савецкага перыяду адбылося канчатковае ўмацаванне і зацверджанне панавання на доўгія дзесяцігоддзі адзінай марксісцка-ленінскай метадалагічнай парадыгмы, праз прызму якой палітычныя партыі і будуць даследавацца на наступных этапах савецкага перыяду. Напрыклад, У.Р. Кічэеў адзначае, што савецкая гістарыяграфія палітычных партый Расіі пачатку ХХ ст. непазбежна ўпіралася ў неабходнасць класіфікацыі партыйных аб'яднанняў, бо не існавала іншай аб'ектыўнай магчымасці для правядзення сапраўды навуковага аналізу палітычнай гісторыі і больш-менш дакладнага вызначэння месцазнаходжання тых ці іншых арганізацый у агульнарасійскім партыйным спектры. Тэарэтычную ж аснову навуковых пошукаў савецкіх даследчыкаў, натуральна, складала ленінская спадчына [4, с. 106].

Такім чынам, адна з першых навуковых класіфікацый палітычных партый была заснавана на адзіным крытэры – класавым. Паводле гэтай класіфікацыі, аўтарам якой доўгі час лічыўся У. І. Ленін, вылучаліся ча-

тыры групы партый: *пралетарскія, дробнабуржуазныя, буржуазныя* (падзяляліся ў сваю чаргу на ліберальна-буржуазныя і рэакцыйна-буржуазныя), *памешчыцка-манархічныя.* Аднак па заўвагах аўтараў працы "Палітычныя партыі Расіі: гісторыя і сучаснасць", аналіз ленінскіх тэкстаў паказвае, што такога жорсткага дзялення ён не даваў, а яно хутчэй характэрна для "Кароткага курсу гісторыі УКП(б)". Сам Ленін у артыкуле "Вопыт класіфікацыі рускіх палітычных партый" называе наступныя тыпы партый: "1) чарнасоценцы; 2) акцябрысты; 3) кадэты; 4) трудавікі і 5) сацыял-дэмакраты". У той жа працы ён праводзіць і такі падзел: партыя свядомага, сацыялістычнага пралетарыяту, партыі радыкальнай або радыкальна дробнай буржуазіі, партыі ліберальна-буржуазныя, партыі рэакцыйна-буржуазныя. Тая ж класіфікацыя паўтараецца праз сем і восем гадоў у двух артыкулах: "Выбарчая кампанія ў IV Дзяржаўную думу" і "Палітычныя партыі Расіі" [5, с. 8].

Пачынаючы з другой паловы 1950-х гг., савецкія даследчыкі сталі пастунова пераглядаць некаторыя спрошчаныя ўяўленні першых тамоў "Гісторыі грамадзянскай вайны ў СССР" і "Кароткага курсу гісторыі УКП(б)". Хаця перагляд і быў строга акрэслены межамі пануючай ідэалогіі, ён даў сур'ёзны штуршок развіццю даследаванняў праблематыкі палітычных партый. Далейшае вывучэнне палітычных партый стала магчымым дзякуючы пашырэнню круга даступных крыніц, у першую чаргу архіўных [2, с.161].

Крытыка культу асобы Сталіна, спроба пераасэнсавання асобных гістарычных фактаў узмацнілі цікавасць да вывучэння небальшавісцкіх партый у канцы 1950-70-х гг. У гэты перыяд канчаткова зацвярджаецца дэфініцыя "*непралетарскія партыі*" для характарыстыкі ўсіх палітычных праціўнікаў бальшавікоў. Як сцвярджае У. Р. Кічэеў, сапраўдным патрыярхам вывучэння непралетарскіх партый у савецкай гістарычнай навуцы стаў Л. М. Спірын, аўтар некалькіх найважнейшых работ [4, с.106].

На мяжы 1970-1980-х гг. з'явіўся шэраг новых прац, прысвечаных вывучэнню "памешчыцкіх", "буржуазных", "дробнабуржуазных" партый, а таксама рознага роду анархісцкіх груповак. Нягледзячы на тое, што ў пераважнай колькасці выпадкаў ацэнкі палітычных аб'яднанняў даваліся ў традыцыйным духу, прыцягненне аўтарамі новых архіўных крыніц, галоўнае – пашырэнне праблематыкі, дазволілі прадставіць дзейнасць партый з іншага ракурсу. Характарызуючы новыя даследаванні, В. В. Шалахаеў і К. А. Салаўёў, заўважаюць, што паўстала сітуацыя, калі нярэдка за назвамі, што захаваліся, (напрыклад, "барацьба бальшавікоў супраць...") у працэсе даследаванняў рабіліся назіранні, якія выходзілі далёка за звыклыя гістарыяграфічныя рамкі. Па меркаванні аўта-

раў, прыходзіла ўсведамленне, што палітычны працэс у Расійскай імперыі пачатку XX ст. не з'яўляўся лінейным, а месца ў ім партый не было такім відавочным, як здавалася раней [6, с. 140].

У канцы 1970 – пачатку 1980-х гг. праблематыка палітычных партый стала вельмі інтэнсіўна абмяркоўвацца на разнастайных канферэнцыях, форумах і ў перыёдыцы. Па сцверджаннях В. В. Шалахаева і К. А. Салаўёва, на падобных усесаюзных канферэнцыях усё часцей гучала думка аб неабходнасці скарэктаваць уяўленні аб партыях. Група даследчыкаў (У. В. Комін, К. У. Гусеў, Л. М. Спірын і інш.) на канферэнцыі ў 1982 г. ў горадзе Калініне прапанавалі пачаць падрыхтоўку калектыўнай абагульняючай манаграфіі па гісторыі расійскіх непралетарскіх партый "Непралетарскія партыі Расіі. Урок гісторыі". Праца над манаграфіяй паказала, што патрабавалася франтальная "рэвізія" савецкага досведу вывучэння палітычных партый. Гэтая "рэвізія", з аднаго боку, дазваляла крытычна асэнсаваць вынікі працы некалькіх пакаленняў дасавецкіх, савецкіх і замежных гісторыкаў палітычных працэсаў пачатку XX ст., з другога – намеціць новыя шляхі вывучэння гэтай тэмы.[6, с. 141]. На гэтым этапе савецкія навукоўцы прыйшлі да высноваў, што, па-першае, больш увагі варта надаць вывучэнню тэорыі і метадалогіі партый праз асэнсаванне спадчыны класікаў замежнай парталогіі. Па-другое, звярнуць увагу на асаблівасць і непаўторнасць працэсу фарміравання палітычных партый у Расіі.

Для другой паловы 1980-х гг., акрамя вывучэння непралетарскіх партый, быў характэрны пошук новых поглядаў на класіфікацыю палітычных партый, якая грунтавалася б на комплексным падыходзе. Напрыклад, Л. М. Спірын падлічыў колькасць партый у Расіі ў канцы XIX – пачатку XX ст. і падзяліў партыі на агульнарасійскія і нацыянальныя, легальныя (памешчыцка-манархічныя і буржуазна-кансерватыўныя), паўлегальныя (буржуазна-ліберальныя) і нелегальныя (сацыял-дэмакратычныя, народніцкія і бальшавіцкая). Партыі пры гэтым былі аб'яднаны аўтарам у тры палітычныя лагеры: урадавы (памешчыцка-манархічныя і буржуазна-кансерватыўныя партыі), ліберальна-апазіцыйны (буржуазна-ліберальныя партыі), рэвалюцыйна-дэмакратычныя (дробнабуржуазныя і бальшавікі) [7, с. 3-4]. Яшчэ адной прыкметнай падзеяй другой паловы 1980-х стаў выхад у 1987 г. манаграфіі В. В. Шалахаева "Партыя акцябрыстаў у перыяд першай расійскай рэвалюцыі".

Нягледзячы на апісаныя вышэй змены, для работ усяго савецкага перыяду характэрны ідэалагізаваны падыход да вывучэння палітычных партый. Асноўныя намаганні савецкіх даследчыкаў накіроўваліся на абгрунтаванне "накіроўваючай ролі кампартыі" і выяўленне антынарод-

нага характару буржуазных партый [8]. Тым не менш, у распрацоўках савецкіх навукоўцаў Ф. М Бурлацкага, М. М. Марчанкі, В. Я. Чыркіна і іншых утрымліваліся рацыянальныя моманты і высновы, якія тычацца сутнасці, функцый, тэндэнцый развіцця палітычных партый у сучасным свеце. Яшчэ раз адзначым, што марксісцкая літаратура зыходзіла з таго, што ў вызначэнні сутнасці партый першаснае значэнне мае класавы падыход. Меркавалася, што ўсякая партыя павінна мець пэўную сацыяльную базу, выказваць інтарэсы тых ці іншых класаў, слаёў, груп. Аднак у рэчаіснасці партыі неабавязкова ўзнікалі выключна на “аднастайнай” сацыяльнай аснове і далёка не заўсёды адлюстроўвалі інтарэсы толькі тых груп, прадстаўнікамі якіх яны намінальна з’яўляліся.

Тыповымі для савецкага грамадазнаўства з’яўляліся наступныя азначэнні партыі: партыя – гэта “найбольш актыўная і арганізаваная частка якога-небудзь класа альбо яго пласта, якая выказвае іх інтарэсы” [9], або: партыя “ ёсць палітычная арганізацыя, якая выказвае інтарэсы грамадскага класа або яго пласта, якая аб’ядноўвае іх найбольш актыўных прадстаўнікоў і кіруе імі ў дасягненні пэўных мэтаў і ідэалаў. Палітычная партыя –вышэйшая форма класавай арганізацыі” [10].

Па сцвярджэнні беларускага даследчыка Т. Г. Салавей, у савецкі перыяд многія аўтары абмяжоўваліся вылучэннем трох асноўных функцый (перш за ўсё на прыкладзе марксісцка-ленінскіх партый): *праграмнай* – вызначэнне генеральнай лініі, стратэгічных задач развіцця грамадства; *арганізатарскай* – правядзенне ў жыццё палітычнага курсу партыі, арганізацыя ўзаемадзеяння партыі з прадстаўнічымі і іншымі органамі ўлады, падбор, расстаноўка кадраў; *ідэйна-выхаваўчай* – палітычная адукацыя і выхаванне членаў партыі і яе прыхільнікаў, фарміраванне грамадскай думкі і інш [11, с. 27].

Такім чынам, менавіта ў другой палове 1980-х гг. былі закладзены трывалыя асновы вывучэння палітычных партый, якія разам з зацвярджаннем прынцыпаў тэарэтычнага і метадалагічнага плюралізму ў спалучэнні са зменамі ў сацыяльна-палітычным жыцці СССР прывялі да з’яўлення новых альтэрнатыўных канцэпцый і даследаванняў палітычных партый. Аднак відавочна, што працы ўсяго савецкага перыяду, прысвечаныя вывучэнню праблематыкі палітычных партый, безумоўна, маюць вялізную значнасць каштоўнасць. Адзначым, што менавіта выкарыстоўванне *гістарыяграфічнага аналізу* дазволіла правесці параўнальна-абагульняючае даследаванне ўсяго савецкага перыяду вывучэння палітычных партый, а таксама раскрыць змест асноўных этапаў гістарыяграфіі гісторыі палітычных партый, даць ім узважаную ацэнку, вызначыўшы каштоўнасць канрэтных прац сёння.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Приступа Н. Н.* История политических партий России (XIX-XX вв.): Историография проблемы: учеб.-метод. комплекс по учеб. дисциплине для спец. 1-02 01 02 06 История. Социально-политические дисциплины // Репозиторий БГПУ. URL: http://elib.bspu.by/handle/doc/266. (Дата доступу: 13.11.2022).

2. Историческая наука в Московском университете. 1755–2004 /Под ред. С.П.Карпова. М.: Изд-во Моск. ун-та., 2004. 640 с.

3. *Холяев С. В.* Политические партии и власть в России начала XX века (1905-1922 годы): дис. на соискание уч. ст. докт. истор. наук: 5.6.1./ С.В. Холяев. Ярославль, 2022. 499 л.

4. *Кичеев В. Г.* О классификации политических партий России начала XX в. в советской историографии // Известия АлтГУ. 2009. № 4-1. С.106-108.

5. Политические партии России: история и современность./ Под ред. проф. А.И. Зевелева, проф. Ю.П. Свириденко, проф. В.В. Шелохаева. М.: “Российская политическая энциклопедия” (РОССПЭН), 2000. 631 с.

6. *Шелохаев В. В.,* Соловьёв, К. А. Политические партии России в начале XX в. как историографическая проблема // Российская история. 2021. Вып. 1. С. 139-150.

7. *Спирин Л. М.* Россия, 1917 год: из истории борьбы политических партий. М.: Мысль, 1987. 333 с.

8. Партия новаторов, партия созидателей: (материал в помощь лектору) / И. Ф. Романовский, Г. И. Ермашкевич. Минск : Правление общества "Знание" БССР, 1985. 23 с.

9. Краткий политический словарь. М., 1989. 410 с.

10. Философский энциклопедический словарь. М., 1983. 482 с.

11. *Соловей Т. Г.*Политические партии и партийные системы: учебное пособие для студентов юридического факультета специальности 1-23 01 06 "Политология" / Т.Г. Соловей. Минск :БГУ, 2005. 65 с.